# 1915

## Памяці Юзюка Пашкевіча

Яшчэ адна ахвяра вайны — а колькі іх усяго?!

*„Юзюк Пашкевіч — падпаручык ...палка — 10/II 1915 году аддаў душу, баронячы Гродна“...*

Гэткі кароткі напіс зроблены на магілцы добра вядомага віленскім беларусам падпар. Пашкевіча, пахаванага да часу ў Гродні.

Неяк не шанцавала яму ад самага пачатку вайны.

28 жніўня яго ранілі ў Прусіі: прастрэлены былі рука і нага, кантужана галава.

Лячыць павязьлі ў родны горад — Вільню, дзе паўжыцьця пражыў.

Не пасьпеў зусім паправіцца, вярнуць сілы, — а 18 лістапада ізноў паехаў на пазыцыі.

28 сьнежня пісаў адтуль:

„Як толькі прыехаў, то зара атрымаў роту і ўжо ею камандую трэці месяц.

Людзі мае вельмі добрыя і любяць мяне, бо як пачулі, што мяне хочуць перавясьці ў другую роту, то прасілі не пакідаць іх... Яны знаюць, што за іх плечы не схаваюся, як будзець туга і каждую мінуту могуць забіць...“

Быццам напрарочыў сабе...

10 лютага — ужо будучы пад Гроднам — загадалі Пашкевічу вясьці роту ў атаку. Пайшоў сам наперадзе.

Ішлі па голым полі. Разам затрашчалі кулямёты, засыпалі ўсіх градам куль.

Прастрэлены ў трох мясцох — у грудзі і ў жывот, падпаручык Пашкевіч упаў на зямлю першы. І ўжо болей ня ўстаў.

Салдаты пахавалі яго недалёка ад таго месца, дзе ён душу аддаў. Тры дні на тым полі ішоў бой, тры дні лілася йшчэ кроў...

Дайшла сумная вестка да Вільні. Тутака лечыцца брат нябожчыка — капітан Вацюк Пашкевіч[1], жыве сястра яго — сястра міласэрдзя[2] ў заразным бараку. Яны ўдвох з прыяцелем забітага паехалі ў Гродна — шукаць цела.

Знайшлі скора: салдаты зь сьлязьмі ў вачах вялі іх і выкапывалі з магілы забітага свайго камандзіра, каторы паказаў, што папраўдзе ніколі за іх плечы не хаваўся, заўсёды быў пры іх, думаў аб іх.

А пад той час за чвэрць вярсты — быццам страшэнная музыка — грымелі гарматы, разрываліся шрапнэлі...

Цела пакуль што пахавалі ў Гродні — каля капліцы. Пасьля павязуць у Лідзкі павет, дзе Пашкевіч радзіўся, дзе йшчэ цяпер жывуць бацькі яго старэнькія.

А яго гэтак заўсёды цягнула да сябе родна зямліца. Заўсёды думаў, што пасьля вайны пакіне службу і сядзе на родны загон — між сваім народам, каторы гэтак любіў.

Юзюк Пашкевіч заўсёды быў шчырым беларусам, ад роднай мовы не адракаўся. Заўсёды гаварыў ёй, пісьмы пісаў па–беларуску.

Тут, у Вільні, бываў усюды, дзе зьбіраліся беларусы[3]. Між імі чуў сябе найлепей.

У роднай старонцы сьмерць яго спаткала. На сваей зямлі косьці злажыў.

Не судзіла яму доля прыждаць лепшых часоў, ясьнейшай будучыны Беларусі, у каторую шчыра верыў.

Хай жа будзе яму лёгкай гэта зямліца родная, мілаваная!